*Электронны бюлетэнь:*

# ЛГБТК+ у беларускіх масмедыя ў 2023 годзе

Журналісты за талерантнасць

2023

# Змест

Маніторынг мовы варожасці ў дачыненні ЛГБТК+ у СМІ Беларусі: 01-10.2023 (рэзюмэ) ........ 3

Асвятленне тэматыкі ЛГБТК+ у беларускіх масмедыя:

- Аналіз становішча - 01-03.2023 ........ 4
- Аналіз становішча - 04-06.2023 ........ 5
- Аналіз становішча - 07-09.2023 ........ 7
- Аналіз становішча - 10-12.2023 ........ 9

## Маніторынг мовы варожасці ў дачыненні ЛГБТК+ у СМІ Беларусі: 01-10.2023 (рэзюмэ)

“Журналісты за талерантнасць” рэгулярна ладзяць маніторынг мовы варожасці ў стасунку ўразлівых групаў у СМІ Беларусі, у тым ліку штогадовыя маніторынгі рыторыкі ў адносінах ЛГБТК+. У 2023 годзе прысутнасць некарэктнай рыторыкі і мовы варожасці ў дачыненні ЛГБТК+ адсочвалася на працягу дзесяці месяцаў – са студзеня па кастрычнік. У гэтым годзе становішча з рэпрэзентацыяй ЛГБТК+ у медыяпрасторы застаецца складаным пасля драматычнага пагаршэння становішча ў 2022 годзе:

- У 2023 годзе 51% публікацыяў у СМІ ўтрымлівалі карэктную лексіку ў дачыненні ЛГБТК+, і 49% - некарэктную. Доля карэктных матэрыялаў у СМІ зноў некалькі перавышае долю некарэктных, але гэтае становішча надзвычай няўстойлівае.
- У 2023 годзе ў СМІ нацыянальнага маштабу некарэктная лексіка стала сустракацца радзей, чым у мясцовых СМІ, гэта істотны прагрэс у параўнанні з 2022 годам. Пры гэтым у СМІ мясцовага маштабу тэма практычна знікае, а калі і прадстаўленая, то ў кантэксце распальвання нянавісці.
- Як і ў 2022 годзе практычна кожная другая публікацыя на тэму ЛГБТК+ у беларускіх СМІ ў 2023 годзе ўтрымлівае праявы мовы варожасці. Тым не менш, трэнд на рост распальвання нянавісці ў геаметрычнай прагрэсіі, які быў характэрны для 2020-2022 гадоў, прыпынены.
- У 2023 годзе мы зноў, як і ў 2022, назіраем становішча, калі для распальвання нянавісці выкарыстоўваецца карэктная лексіка. Што датычыцца некарэктнай лексікі, у пераважнай большасці выпадкаў ёй спадарожнічаюць праявы мовы варожасці.
  *Падрабязней гл.:* *https://gpress.info/wp-content/uploads/j4t-hs-monitoring-2023-final-ru-edited.pdf*

## Асвятленне тэматыкі ЛГБТК+ у беларускіх масмедыя.
## Аналіз становішча – 01-03.2023

I квартал 2023 года не вылучаўся нападкамі праўладных СМІ на ЛГБТК+ супольнасць.

Звычайныя “ківанні” ў бок т.зв. «калектыўнага Захада», які, маўляў, жадае разбурыць «традыцыйныя каштоўнасці» беларусаў. Выданне “СБ . Беларусь сёння” наогул лічыць, што “У беларускім соцыюме праблемы ЛГБТ-кам'юніці не існуе як такой”.

Зацікаўленасць выклікаў фармат асвятлення ЛГБТК+-павесткі на сайце Нацыянальнага тэлебачання. За 1 квартал 2023 года там выйшлі дзве навіны на дадзеную тэматыку, і абедзьве ў нейтральным стылі. У іх адсутнічае мова варожасці, ацэначныя суджэнні або аўтарскія меркаванні, характэрныя для падобнага кшталту матэрыялаў на сайтах прапагандысцкіх СМІ.

Гаворка ідзе пра навіны “Ва Украіне прапанавалі легалізаваць аднаполыя шлюбы паміж вайскоўцамі” і “ЛГБТ-жаўнеры давялі, што "любяць Украіну"”.

Цытата з апошняй навіны наогул ставіць рэкорды свабоды слова ў беларускіх праўладных СМІ: “… традыцыйныя каштоўнасці, якія прасоўвае расійскі прэзідэнт, сталіся стымулам для ўкраінскіх геяў запісвацца ў УСУ і рабіцца патрыётамі. З-за гэтага іншыя ўкраінцы сталі больш пазітыўна глядзець на геяў і трансгендараў”.

Як негалосную каманду не кранаць сваіх прыспешнікаў у ЛГБТК+ супольнасці магчыма расцэньваць і выказванні А.Лукашэнкі падчас т.зв. паслання да народа і парламента.

Пасля звычайнай гамафобнай рыторыкі Лукашэнка заявіў:
“Я даручыў, дакладзіце мне, дайце характарыстыку, што гэта за людзі, як яны працуюць... Дай бог не-геям так працаваць, як яны. Аніводнай адмоўнай характарыстыкі не было. Аніводнай, правяраў па розных кірунках.”

*Падрабязней гл.: https://gpress.info/2023/05/30/daydzhest-asvyatlenne-lgbtk-tematyki-l-belaruskih-masmedyya-1-kvartal-2023/*

II квартал 2023 года вызначыўся шумам вакол ідэі забароны “ЛГБТ-прапаганды” на ўзор РФ.

Варта адзначыць, што напярэдадні Лукашэнка, выказваючыся пра геяў, адзначыў: “...Ну давайце мы гэтым мужыкам будзем забараняць кувыркацца з іншымі мужыкамі, на да чаго гэта прывядзе? Ні да чога. Тым больш праблемаў нам не ствараюць, працуюць добра”.

Адсюль побач з выказваннямі праўладных актывістаў і прапагандыстаў з'явіліся і цалкам адназначныя заявы дэпутатаў: “Дэпутаты лічаць, што пакуль у Беларусі і без закона працуюць больш эфектыўна”.

Міністарка працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч выказалася ў тым самым духу: “Разглядаць чайлдфры, ЛГБТ як тэндэнцыю ў беларускім грамадстве не бачу падставаў”.

Не збіраецца ўносіць прапановы пра забарону “прапаганды ЛГБТ” і той, хто задаў пытанне Лукашэнку – Алег Гайдукевіч. Вось яго цытата: “Я пачуў галоўнае для сябе – прапаганды нетрадыцыйных каштоўнасцяў, таго, што разбурае сям'ю і нашыя падваліны, у Беларусі не будзе, і **большага мне не трэба**. Я ўбачыў дакладную пазіцыю кіраўніка дзяржавы”.

Адзначым, што апошнюю прапанову ў цытаце магчыма трактаваць як з пазіцыі “прапаганды ЛГБТ у нас няма і гэтага мне дастаткова”, гэтак і “забароны прапаганды ў нас не будзе і гэта мяне задавальняе”.

У сярэдзіне красавіка 2023 года, абмяркоўваючы чарговыя папраўкі ў закон аб СМІ, беларускія дэпутаты прапанавалі дадаць яго забаронай на “прапаганду ЛГБТК+”. Кіраўнік Мінінфарма ў адказ на гэту прапанову адзначыў, што ведамствам ужо прынятыя “дастатковыя захады для таго, каб распаўсюд такой прадукцыі ў нашай краіне быў абмежаваны”.

І дадаў, што, на ягоную думку, да распрацоўкі такога законапраекта неабходна «падысці комплексна, і асноўную ролю павінны выканаць заканадаўцы, сцягнуўшы да сябе разнастайныя ведамствы: і Мінадукацыі, і Міністэрства аховы здароўя, і Мініфарм, і МУС, каб гэта быў комплексны і шырокі прававы акт».

Акрамя гэтага, міністр інфармацыі паведаміў, што ведамствам былі разасланыя 500 лістоў-папярэджанняў усім выдаўцам і кнігарням: калі падобную літаратуру ў продажы знойдуць, то “будуць прымацца пэўныя захады адміністрацыйнага ўздзеяння”.

І вось 19 чэрвеня сталася вядомым, што сілавікі прапануюць увесці “адміністрацыйную адказнасць за прапаганду нетрадыцыйных сэксуальных адносінаў, змены полу, педафіліі ды чайлдфры”. Пра ўсе гэтыя ініцыятывы прадстаўнікі Генпракуратуры распавялі адначасова з новаўвядзеннямі па абароне дзяцей ад сэксуальнага гвалту і эксплуатацыі.

Увесці адміністрацыйную адказнасць за прапаганду “нетрадыцыйных сэксуальных адносінаў” прапанавалі ў Генпракуратуры. Ідэю падтрымаў Аляксандр Лукашэнка. Пра гэта распавялі ў прэсавай службе нагляднага ведамства.

Станоўчым мы лічым з'яўленне ў эфіры незалежных медыяў шэрагу матэрыялаў, якія крытычна падыходзяць да рэплікаў праўладных спікераў. Незалежныя СМІ аналізуюць падобныя выказванні і пісьменна дэзавуіруюць іх: “Дэпутат заявіў, што людзі не гдядзяць фільмы ЛГБТ-тэматыкі. А на самай праве цудоўна глядзяць”.

Процівагай праўладнай прапагандзе сталася з'яўленне праграмы *Gender Gap* на Еўрарадыё. У эфіры доктарка навук Ірына Сідорская разглядае гендарную павестку і агучвае навукова абгрунтаваныя доказы, якія разбураюць дзяржпрапаганду:

“Чайлд-фры і ЛГБТ знішчаюць нацыю? У чым не мае рацыі Лукашэнка: Gender Gap”. “Цяпер вы пра правы жанчын, а потым гей-шлюбы падсунеце! - абмяркоўваем”.

*Падрабязней гл..: https://gpress.info/2023/08/21/daydzhest-asvyatlenne-lgbtk-tematyki-l-belaruskih-smi-za-ii-kvartal-2023-goda/*

Асвятленне тэматыкі ЛГБТК+ у беларускіх масмедыя.
Аналіз становішча – 07-09.2023

III квартал 2023 года вызначыўся значным павелічэннем згадак ЛГБТК+ тэматыкі ў праўладных і незалежных медыя.

Адна з асноўных прычын – ініцыяванне Генеральнай пракуратурай Беларусі законапраекта “Аб адміністрацыйнай адказнасці за прапаганду нетрадыцыйных сэксуальных адносін, змены полу, педафіліі і чайлдфры”.

Ініцыятыва стала падставай для чарговага вітка мовы варожасці з боку прапагандыстаў і праўладных актывістаў. Хаця, як адзначаюць эксперты, адсутнасць такога закона не перашкаджала гамафобнай рыторыцы рэжыму і яго функцыянераў.

У сувязі з гэтым важным уяўляецца разгляд гэтага наратыву, прычын і магчымых прагнозаў. Як гэта робіць доктарка філалагічных навук, экспертка ў галіне камунікацыі Ірына Сідорская.

Значная частка матэрыялаў у праўладных СМІ прысвечана становішчу з ЛГБТК+ супольнасцю па-за межамі Беларусі, у асноўным, у Еўропе і ЗША. Некалькі артыкулаў былі прысвечаныя і маючым адбыцца выбарам у Польшчы з пазіцыі таго, што гэтая краіна кіруецца т.зв. “калектыўным Захадам”.
Асноўны пасыл такіх публікацый не новы: “Паглядзіце, як там дрэнна, а Беларусь - выспачка стабільнасці, і тут захоўваюцца традыцыйныя каштоўнасці".
Вось характэрная цытата: “Мы ведаем, што Еўропа ўмее гуляць у даўгую і заўсёды будуе дальнабачныя планы. І пакуль яны ствараюць новы кіраваны натоўп, мы, беларусы, будзем ствараць моцны інстытут традыцыйнай сям'і, каб нашыя дзеці не трапілі на кручок еўрапейскай распусты і прапаганды ЛГБТ”.

Мяркуючы па ўсім, з пагаршэннем эканамічнага становішча ў Беларусі будзе нарастаць і гамафобная рыторыка з боку рэжыму, паколькі, цытуючы Ірыну Сідорскую, “Лукашэнку трэба найперш зарабіць сабе палітычны капітал. Па-першае, так, знайсці ворагаў. Ён жа не можа прыняць пункт гледжання, што тое, што ён збудаваў, не працуе. Што людзі жывуць кепска, не бачаць перспектываў. Лепш паказаць, што вінаватыя нейкія ворагі. Вось калектыўны захад, плюс у Беларусі ўнутры таксама ёсць пятая калона. І вось гэтая пятая калона не толькі "змагары", а ў тым ліку вось людзі, як ён называе, "нетрадыцыйнай сэксуальнай арыентацыі".

…Дыктатар ніколі не можа эфектыўна кіраваць складанай сістэмай. Дыктатар спрабуе спрасціць свет, не бачыць усіх яго адценняў, не бачыць розных сацыяльных груп, а дзяліць на чорнае і белае. Гэта вось тая карціна рэальнасці, якую, як мне падаецца, мае Лукашэнка".

*Падрабязней гл..: [https://gpress.info/2023/10/20/daydzhest-asvyatlennya-lgbtk-tematyki-l-belaruskih-smi-iii-kvartal-2023-goda/](https://gpress.info/2023/10/20/daydzhest-asvyatlennya-lgbtk-tematyki-l-belaruskih-smi-iii-kvartal-2023-goda/)*

## Асвятленне тэматыкі ЛГБТК+ у беларускіх масмедыя.
## Аналіз становішча – 10-12.2023

Апошні квартал 2023 года выглядае адносна спакойным у плане ўзгадвання ЛГБТК+ тэматыкі з боку праўладных медыя.

Прапагандай была надзеленая значная ўвага рашэнню Вярхоўнага суда РФ аб прызнанні руху ЛГБТ экстрэмісцкім і забароне яго дзейнасці на тэрыторыі краіны.

Варта заўважыць, што J4t не атрымалася знайсці ўзгадку ў праўладных медыях пра беларускі "антыЛГБТ" закон, які мі поўніўся трэці квартал 2023 года.

Ужо традыцыйным з боку прапагандыстаў стаўся наратыў пра сраўненне жыцця ў Беларусі і "на Захадзе" з яго свабодамі для ЛГБТК+, што, вядома, падаецца ў выключна адмоўным святле.

Цікавым падаецца матэрыял "З-за прапаганды ЛГБТ сям'я з'ехала ў Беларусь пасля 20 год жыцця ў Ірландыі". У ім адзінай прычынай ад'езду называецца "становішча, якое зараз развіваецца на тэрыторыі ўсяго Еўразвязу і ў Ірландыі ў прыватнасці". Вось цытата гераіні матэрыяла – маці сямейства: "Мне баліць сэрца праз тое, што зараз адбываецца ў школах і не толькі ў школах. Гэта паўсюль у паўсядзённым жыцці, гэта на вуліцах, у крамах, па тэлебачанні, гэта прапаганда ЛГБТ, якая ўсё агрэсіўней і агрэсіўней пачынае наступаць і трапляць у галовы нашых дзяцей".

З боку незалежныя медыяў тэма №1 – камінаўт беларускай баскетбалісткі Кацярыны Сныцінай, які яна зрабіла у эфіры кулінарнага шоў Мікалая Халезіна. Гэта ўнікальны выпадак для нашага спорту ў прыватнасці і Беларусі ў цэлым: раней ніхто з настолькі вядомых людзей не казаў пра сваю гомасексуальнасць адкрыта.

У выніку гэтага ў шэрагу незалежных медыя былі размешчаны навіны пра гэты камінаўт, а таксама былі зробленыя інтэрв'ю з Кацярынай.

*Падрабязней гл.: https://gpress.info/2023/12/30/daydzhest-osvescheniya-lgbtk-tematiki-v-belorusskih-smi-10-12-2023/*